■ Урад

# ЗБУДАВАЦЬ У ЧАС

**Старшыня Саўміна праверыў гатоўнасць аб'ектаў да прыняцця Еўрагульняў—2019**

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ даручыў завяршыць у тэрмін будаўніцтва аб'ектаў у Мінску, якія будуць задзейнічаны пры правядзенні ІІ Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе ў Беларусі.**

Як паведаміла прэс-служба Савета Міністраў, на пляцоўцы будаўніцтва Студэнцкай вёскі кіраўніку ўрада далажылі аб ходзе ўзвядзення самага вялікага інтэрната ў комплексе, разлічанага на пражыванне 1800 чалавек. Таксама ў Студэнцкай вёсцы да Еўрагульняў з'явіцца павільён для арганізацыі харчавання афіцыйных удзельнікаў спаборніцтваў. Андрэй Кабякоў даручыў скончыць будаўніцтва інтэрната ў снежні 2018 года. «Усе неабходныя фінансавыя сродкі ёсць, проста трэба працаваць. Снежань 2018 года — і ні днём больш, ніякага плана па ўвозе на 2019 год быць не можа. Да канца 2018-га аб'ект павінен быць гатовы пад ключ, з мэбляй», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. На пляцоўцы павінен быць арганізаваны штодзённы рэжым працы, дадаў ён.

Прэм'ер-міністр таксама азнаёміўся з ходам будаўніцтва новага будынка Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту на скрыжаванні вуліц Ціміразева і Нарачанскай. Цяпер будаўнічая гатоўнасць аб'екта складае каля 50%. Пазначаны прэм'ер-міністрам тэрмін уводу — да 1 верасня 2018 года. Кіраўнік урада падкрэсліў, што ўсё неабходнае для своечасовага завяршэння работ ёсць, фінансаванне ідзе па графіку.

Работы на яшчэ адным аб'екце — будынку шматпрофільнай спартыўнай залы гульнявых відаў спорту — па даручэнні Андрэя Кабякова трэба скончыць да канца гэтага года. Фінансаванне будоўлі па вуліцы Філімонава вядзецца за кошт крэдытных рэсурсаў Банка развіцця, арыенціровачны кошт у бягучых цэнах — 22,2 млн рублёў. У час Еўрагульняў—2019 аб'ект планецца выкарыстоўваць у якасці трэніровачнага ў гульнявых відах спорту (гандбол), а таксама пры неабходнасці і ў адзінаборствах (бокс, вольная і грэка-рымская барацьба, дзюдо, самба).

Прэм'ер-міністр таксама наведаў Палац воднага спорту і ацаніў інфраструктуру, якая можа быць задзейнічана пры правядзенні Еўрапейскіх гульняў у Мінску.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Даслоўна

## ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ Ў МІНСКУ ПА МАШТАБЕ І АРГАНІЗАЦЫІ НЕ САСТУПЯЦЬ НАЙБУЙНЕЙШЫМ СУСВЕТНЫМ СПАРТЫЎНЫМ ФОРУМАМ



**Янез КАЧЫЯНЧЫЧ, выконваючы абавязкі прэзідэнта Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў:**

— Павінен сказаць, што, прыняўшы рашэнне аб правядзенні ІІ Еўрапейскіх гульняў у Мінску, мы зрабілі выдатны выбар. Не толькі таму, што Беларусь паспяхова выступіла ў Баку ў 2015 годзе, дзе заваявала больш за 40 узнагарод, але і таму, што ваша краіна таксама мае добрую спартыўную інфраструктуру, у чым члены ЕАК ужо паспелі не раз пераканацца. Акрамя таго, беларусы моцныя сваімі спартыўнымі традыцыямі, у Мінску ведаюць і ўмеюць арганізоўваць буйныя падзеі. У 2014 годзе тут адбыўся чэмпіянат свету па хакеі, і гэты экзамен вы вытрымалі на выдатна.

Еўрапейскія гульні ў Мінску, я ў гэтым упэўнены, па маштабе і арганізацыі не саступяць найбуйнейшым сусветным спартыўным форумам. На Алімпіядах, напрыклад, большую частку медалёў заваёўваюць менавіта атлеты з Еўропы. І ў 2019 годзе ў сталіцу Беларусі прыедуць многія вядучыя спартсмены, бо ў асобных відах спорту будзе праходзіць кваліфікацыя да ХХХІІ летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа.

Я таксама спадзяюся, што па ліку краін, куды будзе весціся тэлетрансляцыя Еўрагульняў—2019, Беларусь не саступіць Азербайджану. У 2015 годзе спаборніцтвы з Баку трансліраваліся ў 145 краінах. Не ўзнікла і сур'ёзных пытанняў пры рабоце над кантрактам па правядзенні ІІ Еўрагульняў з беларускім бокам, які днямі быў падпісаны ў НАК. Усе зацікаўленыя асобы ведалі ўмовы, на якіх Мінск прыме Еўрагульні, і сёлета толькі адпрацоўваліся дэталі.

Нагадаем, што права правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе Беларусь атрымала на 45-м пасяджэнні Генеральнай асамблеі ЕАК, якое адбылося ў кастрычніку 2016-га ў Мінску. Падчас правядзення Еўрагульняў чакаецца прыбыццё ў беларускую сталіцу і ўдзел у спартыўных і іншых мерапрыемствах больш чым 4 тысяч спартсменаў.

Спаборніцтвы пройдуць з 21 па 30 чэрвеня 2019 года ў 15 відах спорту: у бадмінтоне, боксе, веласіпедным спорце, веславанні на байдарках і каноэ, дзюдо, каратэ, лёгкай атлетыцы, стральбе з лука, кулявой і стэндавай стральбе, настольным тэнісе. Плануецца разыграць ліцэнзіі на Алімпійскія гульні 2020 года ў Токіа.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога сакратара Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ЛІХАЧА Івана Васільевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

■ Камунальныя стасункі

# ЗІМОЙ НЕ ЗАМЕРЗНЕМ

**Капітальныя рамонты жылых дамоў плануецца выконваць не больш за месяц**

**Аб гэтым запэўніў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Генадзь ТРУБІЛА. Ён паведаміў, што цяпер на дамах, якія знаходзяцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ, практычна завершаны прафілактычны рамонт сістэм ацяплення і цеплавых пунктаў.**



### ГАТОЎНАСЦЬ ВЫСОКАЯ

Ужо сёння амаль цалкам выкананы гідраўлічныя выпрабаванні сістэм ацяплення (99%). План па рамонце дахаў выкананы на 91%, стыкаў сценавых панэляў — на 94%, па праверцы прыбораў уліку цеплавой энергіі — на 94%. Работы па цеплавой ізаляцыі выкананы на 100%.

У цэлым па галіне створаны запас у 11,3 тысячы тон паліўнага мазуту ў якасці рэзервовага паліва для газавых кацельняў (100% ад задання), нарыхтавана 1 370 тысяч кубічных метраў драўнянага паліва (77%). Спецыяліст адзначыў, што па стане на 30 жніўня заменена 438,4 км цеплавых сетак, ці 97% ад задання. Капітальна адрамантавана 36 катлоў (92%) і заменена 40 неэканамічных катлоў (57%).

«Арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі зарэгістраваны 41% пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі да работы ў асенне-зімовы перыяд. Падлічана, што лідзіруе па краіне на сёння Гомельская вобласць, дзе атрымана 99% пашпартоў гатоўнасці. Падцягнуцца трэба Гродзенскай і Брэсцкай абласцям», — адзначыў Генадзь Трубіла.

«Падрыхтоўка аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі да работы ў асенне-зімовы перыяд 2017/2018 гадоў знаходзіцца на належным узроўні і будзе завершана ва ўстаноўленыя тэрміны», — сказаў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

### ЦЕПЛАВАЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі плануе вынесці на грамадскае абмеркаванне праект нарматыўна-прававога акта аб цеплавой мадэрнізацыі жылога фонду.

«Думаю, калі дакумент будзе гатовы, а гэта будзе ў найбліжэйшы час, мы яго канчаткова шырока абмяркуем сумесна са СМІ, каб людзі разумелі, як неабходна зберагаць цяпло», — удакладніў сваю пазіцыю Генадзь Трубіла.

Праектам прадугледжана, што цеплавая мадэрнізацыя жылля будзе ажыццяўляцца як за бюджэтныя грошы, так і за сродкі насельніцтва. Намеснік міністра нагадаў, што каля 95% жылога фонду Беларусі знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. «Права ўласнасці абавязвае несці адказнасць за сваё жыллё. З улікам таго, што мадэрнізацыя — затратны працэс, прапрацоўваецца магчымасць удзелу насельніцтва», — растлумачыў намеснік міністра. Як паведамлялася раней, для цеплавой мадэрнізацыі жылля ў Беларусі плануецца ў тым ліку прыцягнуць сродкі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця.

Паведамляецца таксама, што міністэрства плануе ўвесці больш жорсткія нормы правядзення капітальнага рамонту жылых дамоў. Пры гэтым тэрміны ажыццяўлення рамонтных работ будуць скарочаныя да аднаго месяца. У хуткім часе час гэты праект будзе апрабаваны ў Мінску, а таксама ў розных абласцях краіны.

### СТАЛІЦА АДПАВЯДАЕ

Пашпарты гатоўнасці да асенне-зімовага сезона ў Мінску атрымалі ўсе спажыўцы цеплавой энергіі, што абслугоўваюцца арганізацыямі камунальнай формы ўласнасці, паведаміў інжынер ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Ігар Ганчарук. Ён расказаў, што ў межах праведзенага вясновага агляду жыллёвага фонду былі ўдакладнены аб'ёмы работ, сфарміраваныя графікі і планы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы жыллёвага фонду да ацяпляльнага перыяду. Па стане на 1 верасня адрамантавана каля 226,5 тысячы квадратных метраў дахаў (87% ад плана), амаль 128 тысяч метраў пагонных стыкаў сценавых панэляў (92%). Праведзена цеплавая рэабілітацыя больш як 55 тысяч квадратных метраў жылля (94%). Таксама камунальнікі правялі рамонт 664 балконаў (97%). Адрамантавана і паверана каля 2,7 тысячы прыбораў уліку цеплавой энергіі (86,8%), якія знаходзяцца на балансе ЖКГ раёнаў Мінска.

Асаблівая ўвага была ўдзелена праверцы дымавых і вентыляцыйных каналаў у дамах з газавыкарыстоўваючым абсталяваннем.

### АВАРЫЙНЫ БАЛКОН

Амаль 22 тысячы балконаў плануецца адрамантаваць у Мінску ў наступныя чатыры гады, паведаміў Ігар Ганчарук.

«Усяго ў 2017—2020 гадах плануецца адрамантаваць 21 789 балконаў, у тым ліку 4 340 балконаў за кошт сродкаў бягучага рамонту і 17 449 іх за кошт сродкаў капітальнага рамонту», — адзначыў інжынер. На тэхнічным абслугоўванні КУП ЖКГ раёнаў Мінска знаходзіцца 3 675 жылых дамоў са 180 413 балконамі, у тым ліку 3 213 жылых дамоў са 151 219 балконамі з тэрмінам эксплуатацыі звыш 40 гадоў. Падчас пазачарговага агляду выяўлена 149 аварыйных балконаў, 253 патрабуюць дэталёвага абследавання з прыцягненнем спецыялізаваных арганізацый, 510 балконаў патрабуюць першачарговага рамонту.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Прэзідэнт Малдовы прыпыніў рашэнне ўрада адправіць ваенных на вучэнні НАТА

«У адпаведнасці з канстытуцыяй прыняў рашэнне прыпыніць сённяшнюю пастанову ўрада аб удзеле малдаўскіх вайскоўцаў у ваенных вучэннях ва Украіне», — сказаў Ігар Дадон.

Ён адзначыў, што ўпершыню з моманту ўступлення на пасаду прыняў рашэнне скарыстацца канстытуцыйнымі паўнамоцтвамі, якія прадугледжваюць права прыпынення дзеяння актаў урада, якія супярэчаць заканадаўству, да прыняцця канчатковага рашэння Канстытуцыйнага суда.

«Малдова — нейтральная дзяржава, і малдаўскія вайскоўцы не павінны прымаць удзел у ваенных вучэннях, якія праводзяцца пад эгідай якога б там ні было ваеннага блока. Разам з тым мы не будзем перашкаджаць удзелу малдаўскіх ваеннаслужачых у міратворчых манеўрах пад эгідай ААН», — адзначыў Дадон.

Каментуючы гэтае рашэнне прэзідэнта, прэм'ер-міністр Павел Філіп заявіў у сераду на пасяджэнні ўрада, што не разумее, якія аргументы ёсць у прэзідэнта для блакавання ўдзелу малдаўскіх ваеннаслужачых у вучэннях.

### CNN: Клінтан усклала на Сандэрса адказнасць за шкоду яе кампаніі



Хілары Клінтан, якая прайграла прэзідэнцкія выбары ў лістападзе мінулага года Дональду Трампу, у сваёй новай кнізе падвергла крытыцы свайго саперніка ў барацьбе за вылучэнне кандыдатам ад дэмакратычнай партыі на пасаду прэзідэнта — сенатара ад штата Вермонт Берні Сандэрса.

Як паведаміла тэлекампанія CNN, Клінтан сцвярджае, што выпады Сандэрса ў яе адрас у ходзе перадвыбарнай кампаніі «нанеслі доўгатэрміновую шкоду» яе шанцам дабіцца перамогі. «На працягу ўсяго перыяду першасных выбараў кожны раз, калі я спрабавала даць адказ на выпады Берні, мне раілі праяўляць стрыманасць, — гаворыцца ва ўрыўку, прыведзеным тэлекампаніяй. — Прэзідэнт Абама заклікаў мяне сціснуць зубы і пазбягаць Берні, як толькі магчыма. Я адчувала сябе як у кайданах».

### Абэ на перамовах з Пуціным хоча дамагчыся прагрэсу ў заключэнні мірнага дагавора



Прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ на маючых адбыцца 7 верасня ва Уладзівастоку перамовах з прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным хоча дамагчыся прагрэсу ў пытанні заключэння мірнага дагавора. Пра гэта кіраўнік японскага ўрада заявіў у сераду напярэдадні сваёй паездкі ў Расію.

«Дадаўшы яшчэ большай канкрэтыкі ў сумесную эканамічную дзейнасць на паўночных тэрыторыях (так у Японіі называюць расійскія Паўднёвыя Курылы. — **Заўв. ТАСС**) і зрабіўшы наведванне гэтых тэрыторый іх былымі жыхарамі яшчэ больш свабодным, я хачу дамагчыся прагрэсу ў вырашэнні праблемы мірнага дагавора», — заявіў Сіндза Абэ журналістам у Токіа, пасля чаго на ўрадавым самалёце адправіўся ва Уладзівасток. Ён таксама выказаў намер абмеркаваць з расійскім прэзідэнтам праблему КНДР, якая 3 верасня правяла чарговае ядзернае выпрабаванне.